абмежаваныя па колькасці рэспандэнтаў даследаванні паказалі іх важнасць для ўдакладнення нашых уяўленняў аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны.

1. Агееў, А.Р. Штодзённае жыццё вясковага насельніцтва Дрыбінскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны (па матэрыялах гісторыка-краязнаўчай практыкі студэнтаў гістфака МДУ імя А. Куляшова) / А.Р. Агееў // Романовские чтения – 7: сб. статей Международной науч. конференции / под общ. ред. А.А. Воробьева. – Могилев: УО «МГУ им. А.А. Кулешова», 2011. – с. 45 – 46.
2. Агееў, А.Р. Штодзённае жыццё вясковага насельніцтва Шклоўскага раёна ў гады Вялікай айчыннай вайны (па матэрыялах летняй гісторыка-краязнаўчай практыкі студэнтаў гістфака МДУ імя А. Куляшова) / А.Р. Агееў // Романовские чтения – 6 (к 75-летию истор. факультета УО «МГУ им. А.А. Кулешова»): сб. статей Международной науч. конференции. – Могилев: УО «МГУ им. А.А. Кулешова», 2010 – С. 40 – 41.
3. Агееў, А.Г. Штодзённае жыццё ў гады вайны / А.Р. Агееў // Могилевский поисковый весник / сост. Н.С. Борісенко. – Могилев: Могилев. обл. укрупн. тип. им. Спиридона Соболя, 2011. – Вып. 6. – с. 90 – 95.

**Тухта В.У.**

## УСПАМІНЫ МЯСЦОВЫХ ЖЫХАРОЎ ЯК КРЫНІЦА ВЫВУЧЭННЯ ЛАКАЛЬНАГА АСПЕКТА ГІСТОРЫІ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (на прыкладзе Слабадскога сельсавета Лепельскага раёна)

На працягу адзінаццаці гадоў з сябрамі краязнаўчага гуртка “Нашчадкі” Слабадской сярэдняй школы Лепельскага раёна займаемся вывучэннем падзей Другой сусветнай вайны, што мелі месца адбыцца ў нашым краі амаль семдзесят гадоў таму назад. Па шэрагу субектыўных і аб’ектыўных прычын асноўнай крыніцай па якой вывучаем ваенную гістрыю рэгіёна з’яўляюцца менавіта ўспаміны жыхароў нашага сельсавета, як найбольш дастутпная крыніца інфармацыі.

У выніку шматлікіх гутарак, праведзеных інтэрв’ю і апытанняў нам адкрыліся невядомыя да апошняга часу факты мінулай вайны.

Такім чынам стала магчымым складанне спісу ўраджэнцаў Слабадскога сельсавета, якія прымалі ўдзел у свавецка-фінляндскай вайне 1939-1940 гг. Ня сёняшні дзень гэта прозвішчы 26 чалавек, толькі пра 9 землякоў ўтрымліваецца інфармацыя ў кнізе “Памяць. Лепельскі раён”, тых якія загінулі ў ходзе “фінскай” кампаніі. Каштоўнасць дадзенага спісу ў тым, што ён з’яўляецца адзінай крыніцай інфармацыі ўдзелу нашых землякоў у “фінскай” вайне. Улетку 1941 года перад самай акупацыяй Лепельшчыны, архівы райваенкамата былі знішчаны ў полыме пажару. Таму на сёняшні дзень даведацца колькі лепельчан на самай справе прымала ўдзел у той зімняй кампаніі не ўяўляецца магчымым.

Вялікую ролю адыгралі ўспаміны жыхароў у пошуку няўлічаных пахаванняў на тэрыторыі сельсавета. Так, дзякуючы сведчанням шэрагу апавядальнікаў стала вядома сем месцаў ваенных пахаванняў перыяду Другой сусветнай вайны і адно пахаванне савецка-польскай вайны 1919 – 1920 гг. У выніку раскопак праведзеных 52-ім асобным пошуковым батальёнам Міністэрства Абароны падцвердзілась наяўнасць шасці з іх. У шэрагу выпадкаў апавядальнікі самі з’яўлялісь сведкамі гібелі і пахавання партызанаў і чырвонаармейцаў.

У 2010 годзе дзякуючы знойдзеным у архіве Слабадской школы ўспаміныў былога партызана брыгады “Чэкіст” Свірыдава Паўла Міхайлавіча, праведзенаму сябрамі гуртка “Нашчадкі” апытынню жыхароў Слабады, стала магчымым устанавіць імя партызана брыгады “Чэкіст” пахаванага на мясцовых могілках. На магілу да бацькі ўжо некалькі разоў з далёкай Омскай вобласці прыязджала дачка. Каб упэўніцца ў тым, што гэта сапраўды магіла бацькі жанчына сама звярталась з роспытамі да жыхароў Слабады.

Збіраючы інфармацыю пра ўраджэнцаў сельсавета змагаўшыхся з ворагам на фронце і ў партызанскіх фарміраваннях сутыкнуліся з цяжкасцмі ў тым сэнсе, што ўліковыя карткі на ўдзельнікаў вайны, якія захоўваюцца ў Лепельскім райваенкамаце складзены не раней 1984-1985 гг. Паўстала пытанне – як сабраць масксімальна інфармацыю на ветэранаў? Многія з іх адышлі ў лепшы свет за доўга да 1984-1985 гг. Зноў па дапамогу звярнуліся да мясцовых жыхароў. Многія з іх маглі расказаць не

Репозиторий ВГУ

толькі пра сваіх бацькоў, ці дзядоў, але і ўспаміналі хто з аднавяскоўцаў ваяваў і як знайсці іхніх родных. Каб упэўніцца ў праўдзівасці слоў апавядальнікаў прасілі паказаць ваенны білет, чырвонаармейскую кніжку, ці іншы дакумент – адкуль выпісвалі патрэбную нам інфармацыю.

Для параўнання прывядку адзін прыклад. Ва ўліковых картках сельсавета на ўдзельнікаў вайны па стану на 1987 г. налічвалась 38 чалавек. На сёняшні дзень у спісе складзеным "нашчадкамі" пры дапамозе родных і блізкіх ветэранаў значацца прозвішчы 196 ураджэнцаў слабадскога сельсавета і больш за 60 прозвішчаў ветэранаў памежных рэгіёнаў. У гэты спіс занесена інфармацыя і пратых хто памёр у першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі, калі рабіць дасканалы ўлік ветэранаў не ўяўлялась мэтазгодным з-за іх вялікай колькасці.

Не гледзечы на тое, што ўспаміны мясцовых жыхароў даюць толькі лакальныя прадстаўленні пэўнага эпізоду вайны, носяць суб'ектыўны характар, не ствараюць цэласнай карціны таго, што адбывалася ў краі на самай справе, тым не менш яны запаўняюць прабелы ў пэўным гістарычным перыядзе. На тое, як дакладна людзі выкладаюць факты уплываюць розныя акалічнасці – узрост, наколькі апавядальнік быў уцягнуты ў сацыяльныя адносіны свайго населенага пункта, сацыяльнае становішча. Хаця апошняя акалічнасці, ды яшчэ ўзрост не з'яўляюцца вызначальнымі фактарамі ў дакладнасці выкладаемых чалавекам фактаў. Напрыклад, ў 2008 годзе ў в. Слабада Кузьміч Вольга Фёдараўна 1930 г.н пералічыла каля двух дзесяткаў прозвішчаў сваіх землякоў, што прымалі ўдзел у партызанскім руху, і нават назвала хто і ў якой партызанскай брыгадзе значыўся. Шаснаццаць з іх, па словах жанчыны, былі ў складзе быгады "Чэкіст". На чатырнаццаць чалавек названых Вольгай Фёдараўнай знайшлось дакументальнае падцверджанне ў Нацыянальным архіве Беларусі ў тым, што яны сапраўды былі ў складзе брыгады "Чэкіст".

Толькі супастаўляючы вялікую колькасць сабраных сведчанняў, аналізуючы і параўноўваючы з агульнагістарычнымі фактамі, архіўнымі матэрыяламі можна зрабіць пэўныя гістарычныя высновы, скласці цэласную і праўдзіваю карціну таго, што адбывалася на тэрыторыі пэўнага рэгіёна ў гады апошняй вайны.

**Гребень Е.А.**

## ДОКУМЕНТЫ КОЛЛАБОРАЦИОННОЙ АДМИНИСТРАЦИИ КАК ИСТОЧНИК ДЛЯ ИЗУЧЕНИЯ ПЕНИТЕНЦИАРНОЙ СИСТЕМЫ НАЦИСТОВ В ОККУПИРОВАННОМ ВИТЕБСКЕ

Пенитенциарная система понимается как совокупность тюремных мероприятий направленных на кару и исправление заключенных, а также как государственный институт, ведающий исполнением уголовных наказаний (как связанных, так и не связанных с лишением свободы), наложенных на граждан в соответствии с законом [1]. В период немецкой оккупации Беларуси нацисты внедрили здесь свою пенитенциарную систему в соответствии с собственным представлением о новом порядке.

Пенитенциарная система нацистов в оккупированной Беларуси до настоящего времени детально не изучена. Порядок функционирования тюрем лишь фрагментарно затрагивался в отдельных исследованиях. Краткая аннотация фонда Витебской городской тюрьмы дается в статье Шалаевой С.Б. «В оккупированном Витебске» [2, с. 10–11]. Функционирование Витебской тюрьмы затрагивается в работе Ивановой Т.П. «Политика оккупационных властей в Витебске во время Великой Отечественной войны» [3, с. 50]. Однако в настоящее время нельзя говорить о хотя бы частичном изучении этой составляющей оккупационного режима на фоне имеющейся обширного комплекса источников, хранящихся в фондах Государственного архива Витебской области: фонд Витебской тюрьмы (2155, 18 единиц хранения) и фонд местной комендатуры (2116, 3 единицы хранения). Имеющиеся в распоряжении исследователей документы

Репозиторий ВГУ